АПО

ШТОМЕСЯЧНЫ
НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ
ЧАСОПІС

# НАРОДНАЯ Асвета

**СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ**
ПСІХАЛАГІЧНАЕ СУПРАВАДЖЭННЕ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ

**АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПАРТФЕЛЬ**
ПЕДАГАГІЧНЫ САВЕТ: МЕТОДЫКА АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ

**ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ**
ГРАМАДЗЯНСКАЕ І ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ

**ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ «ШКОЛЫ БЕЛАРУСІ»**
СЕМІНАР-ПРАКТЫКУМ «МЕТАДЫЧНЫ ІНСТРУМЕНТАРЫЙ СТРАТЭГІІ АКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ»

**БАЦЬКОЎСКІ СХОД**
ПРАФЕСІЙНАЕ САМАВЫЗНАЧЭННЕ ПАДЛЕТКАЎ

1
2022

# ЧЭЛЕНДЖ ДЛЯ ВУЧНЯЎ І БАЦЬКОЎ «ВЫБІРАЕМ ПРАФЕСІЮ РАЗАМ»

## Павышэнне ўзроўню інфармаванасці ўдзельнікаў у пытаннях прафесійнага самавызначэння



**Т. А. Марцэвіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
Ёдкаўскай СШ Лідскага раёна

**Чэлендж – гэта выклік, іспыт, спаборніцтва, складанае заданне. Арганізацыйна гэта своеасаблівы рух, які дазваляе чалавеку праверыць свае магчымасці. Сэнс чэленджа ў тым, што яго ўдзельнік павінен выканаць шэраг заданняў markup рознага ўзроўню складанасці і перадаць выклік іншым. І калі ў сацыяльных сетках інтэрнэт-заданні носяць забаўляльны характар, то ў адукацыйным працэсе – навучальны і выхаваўчы. Вельмі эфектыўная такая форма дзейнасці ў прафарыентацыйнай рабоце.**

Прапануем вашай увазе **чэлендж для вучняў 9–11 класаў і іх бацькоў «Выбіраем прафесію разам»**.

**Мэта:** павышэнне ўзроўню інфармаванасці вучняў і іх бацькоў у пытаннях прафесійнага самавызначэння.

**Задачы:**
- ❑ актуалізаваць праблему выбару прафесіі для сем'яў навучэнцаў;
- ❑ стварыць прафарыентацыйную інтэрнэт-старонку для вучняў у сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».

**Падрыхтоўчы этап** (на працягу месяца)

Заданне 1. Запоўніць «Чэк-ліст 1»: выбраць тры найбольш прывабныя прафесіі і пад імі злева паставіць знак «+», а справа пералічыць уласныя якасці, што могуць дапамагчы іх асвоіць. Зрабіць фотаздымак запоўненага «Чэк-ліста 1» і размясціць яго на старонцы класа ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».

Заданне 2. Размясціць на старонцы класа «ВКонтакте» «Чэк-ліст-2» і рэгулярна публікаваць там жа інфармацыю аб выкананні заданняў (формы выканання – ролік, рэкламны праспект на мультыбордзе, прэзентацыя).

**Абсталяванне:** чэк-лісты з заданнямі чэленджа, крыжаванка, мультыборд.

**Ход мерапрыемства**

**I. Уводная частка**

Вядучы знаёміць удзельнікаў з тым, як перакладаецца з англійскай мовы слова «чэлендж» (*складаная задача, выклік*), а з французскай мовы слова «прафесія» (*публічная заява аб родзе сваёй дзейнасці*).

**Вядучы.** Форму чэленджа мы з вамі выкарыстаем для таго, каб лепш разабрацца ў свеце прафесій. І пачнём з прытчы.

***Прытча «Пяць шляхоў»***

Пяць падарожнікаў заблукалі ў лесе. Першы пайшоў налева, другі – направа, трэці – назад, чацвёрты – наперад, пяты залез на дрэва, каб убачыць самы кароткі шлях.

Той, хто пайшоў налева, трапіў у самы гушчар. Ён навучыўся выжываць у лесе. Той, хто пайшоў направа, сустрэў разбойнікаў. Ён здолеў абудзіць у іх літасць. Той, хто пайшоў назад, праклаў праз лес сцежку, якая дала яму магчымасць атрымаць асалоду ад маляўнічага наваколля. Той, хто пайшоў наперад, стаў першаадкрывальнікам. Той жа, хто залез на

дрэва, стаў спецыялістам па знаходжанні аптымальных рашэнняў – рацыяналізатарам. Так кожны з пяці падарожнікаў выканаў сваё прызначэнне.

*Арганізуецца абмеркаванне.*

**II. Асноўная частка**

Вядучы і вучні знаёмяць бацькоў з вынікамі выканання заданняў чэленджа.

**Чэк-ліст 1. Прэзентацыя вынікаў**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
|  Перакладчык |  Агранам |  Інжынер |  Эканаміст |  Дызайнер |
|  Юрыст |  Будаўнік |  Шафёр |  Лагіст |  Фатограф |
|  Прадавец |  Настаўнік |  Повар |  Маркетолаг |  Фермер |
|  Урач |  Цырульнік |  Меліяратар |  Менеджар |  Праграміст |

На падставе інфармацыі, размешчанай вучнямі на старонцы класа ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте», арганізуецца абмеркаванне перспектыў прафесіянальнага самавызначэння кожнага з падлеткаў.

❑ **Заданне «Гісторыя прафесіі»**

Вучні прадстаўляюць работы ў выглядзе відэаролікаў, прэзентацый, створаных самастойна на аснове матэрыялаў інтэрнэту і выкладзеных на старонцы класа «ВКонтакте».

**Чэк-ліст 2. Прэзентацыя вынікаў**

| Прафесійны чэлендж | |
|---|---|
|  **Гісторыя прафесіі** |  **Знакамітыя людзі ў прафесіі** |
|  **Плюсы і мінусы прафесіі** |  **Дзе працаваць?** |

На працягу месяца з дня пачатку чэленджа настаўнік таксама размяшчаў у інтэрнэце інфармацыю аб гісторыі розных прафесій. На падставе яе і сфармуляваны пытанні.

***Віктарына «Гісторыя прафесіі»***

1. Якую прафесію ў старажытнасці прыраўноўвалі да магіі? (*Урач.*)

2. Прадстаўнік гэтай прафесіі выкарыстоўвае прадмет працы, назва якога ў перакладзе азначае «тэхніка малявання святлом». (*Фатограф.*)

3. Якая прафесія пачалася з такога занятку, як акультурванне дзікарослых раслін? (*Аграном.*)

4. Якая сучасная прафесія «вырасла» з заснаванага ў XIX ст. англійскімі мастакамі «Таварыства заахвочвання прамыслова-гандлёвых тавараў»? (*Дызайнер.*)

5. Назва якой прафесіі паходзіць ад лацінскага слова, што перакладаецца як «прыроджаныя здольнасці»? (*Інжынер.*)

6. Якая прафесія, што ўзнікла сотні гадоў назад (калі з'явіліся асноўныя эканамічныя паняцці «тавар», «абмен», «грошы»), і сёння застаецца адной з самых запатрабаваных? (*Эканаміст.*)

7. Прадстаўнік якой сучаснай прафесіі называўся некалі «апальшчык», або «качагар», бо ён павінен быў сачыць за ўзроўнем паліва ў паравым аўтамабілі? (*Шафёр.*)

8. З'яўленню якой прафесіі мы абавязаны выхадам нашых далёкіх продкаў з пячор? (*Будаўнік.*)

9. Папярэднікамі якой сучаснай прафесіі лічацца старажытнагрэчаскія сафісты, хаця сама прафесія з'явілася ў старажытным Рыме? (*Юрыст.*)

10. Назва якой прафесіі з'явілася ў глыбокай старажытнасці, але яе прадстаўнікі займаліся не тым, чым сёння, а арганізацыяй вайсковых паставак? (*Лагіст.*)

11. Хто сёння замяніў колішніх купцоў? (*Прадавец.*)

12. Назва якой прафесіі ў Старажытнай Грэцыі гучала гэтак жа, як і ў нас сёння, і азначала «той, хто вядзе дзіця»? (*Педагог.*)

13. Прадстаўнікоў якой прафесіі сам англійскі кароль Георг II папрасіў на працы насіць белы каўпак, што яны і робяць дагэтуль? (*Повар.*)

14. Папярэднікам якой запатрабаванай сёння прафесіі быў майстар на мануфактуры? (*Менеджар.*)

15. Прадстаўнікі якой прафесіі, акрамя тых абавязкаў, што яны выконваюць у наш час, у Сярэдняевеччы па сумяшчальніцтве былі яшчэ і стаматолагамі, і хірургамі? (*Цырульнік.*)

16. Назва якой прафесіі прыйшла ў нашу мову з нямецкай разам з пачаткам работ па паляпшэнні земляў? (*Меліяратар.*)

❑ **Заданне «Знакамітыя людзі»**

Вучні дэманструюць падрыхтаваныя дома прэзентацыі, прысвечаныя вядомым прадстаўнікам прафесіі, якія хацелі б набыць.

*Арганізуецца абмеркаванне.*

***Варыянт пытанняў***

- ✓ Чаму, на ваш погляд, гэтыя людзі сталі прафесіяналамі высокага ўзроўню?
- ✓ Ці заўважылі вы ў іх характарах агульныя рысы, што абумовілі дасягненні прафесійнага поспеху?
- ✓ Як вы лічыце, ці дабіліся б героі вашых прэзентацый прызнання, калі б абралі іншую сферу дзейнасці?

❑ **Заданне «Плюсы і мінусы прафесіі»**

Вядучы зачытвае размешчаныя на старонцы класа «ВКонтакте» меркаванні вучняў адносна станоўчых і адмоўных бакоў прафесій, якія яны хацелі б набыць у будучым.

*Плюсы:* запатрабаванасць, высокая аплата працы; шырокія магчымасці для зносін; перспектывы кар'ернага росту; грамадская значнасць; магчымасць працаваць на сябе; наяўнасць шляхоў прафесійнага развіцця; разнастайнасць працоўных абавязкаў; цікавыя камандзіроўкі; адсутнасць неабходнасці мець вопыт работы па спецыяльнасці, мець вышэйшую адукацыю; камфортныя ўмовы працы; працяглы адпачынак; зручны графік работы; магчымасць набыцця вопыту прадпрымальніцтва; магчымасць працаваць дыстанцыйна.

*Мінусы:* вялікая канкурэнцыя; неабходнасць валодаць вялікім аб'ёмам ведаў; складанасць, адказнасць, вялікі аб'ём працы; неабходнасць пастаяннага развіцця; невысокія заробкі на старце; аднастайнасць працы; адсутнасць паразумення з заказчыкамі, кіраўнікамі; практычная і эмацыянальная складанасць; вялікая фізічная нагрузка; ненармаваны працоўны дзень; сядзячая праца; адсутнасць кар'ернага росту; шкоднасць, небяспечнасць умоў працы; неабходнасць падладжвацца пад патрабаванні заказчыкаў; неабходнасць шмат часу праводзіць на нагах; пастаянныя стрэсавыя сітуацыі; матэрыяльная адказнасць; сезоннасць працы.

*Арганізуецца абмеркаванне.*

***Варыянт пытанняў***

- ✓ *Пытанні бацькам.* Ці ёсць мінусы ў вашай прафесіі? Калі ёсць, то чым вы іх кампенсуеце?
- ✓ *Пытанні вучням.* Ці бачыце вы мінусы ў абранай вамі прафесіі? Калі так, то чаму гатовы з імі мірыцца?

Вядучы падкрэслівае важнасць усведамлення школьнікамі ўзаемасувязі пэўнай прафесіі і сферы, дзе працуюць яе прадстаўнікі. Удзельнікам

раздаюцца лісты з тэматычнай крыжаванкай. Пакуль бацькі і вучні разгадваюць яе, гучыць аўдызапіс апавядання М. Зошчанкі «Хто вашы бацькі?».

*Крыжаванка «Дзе працаваць?»*

Вядучы прапануе ўдзельнікам выбраць назвы толькі тых месц працы, якія падыходзяць для падстаноўкі ў крыжаванку: ***фірма, банк, школа, магазін, атэлье, фабрыка, завод, кампанія, прадпрыемства, бальніца, рэстаран, суд, гаспадарка, салон, арганізацыя, станцыя, база, комплекс, агенцтва, цэнтр***.



*Адказ.* 1. Суд. 2. Прадпрыемства. 3. Завод. 4. Фабрыка. 5. Салон. 6. Комплекс. 7. Рэстаран. 8. Агенцтва. 9. Станцыя. 10. Школа. 11. База. 12. Банк. 13. Атэлье. 14. Гаспадарка. 15. Цэнтр.

**III. Заключная частка. Рэфлексія**

Вядучы абагульняе вынікі чэленджа і прапануе ўдзельнікам адказаць на пытанні.

***Пытанні для вучняў***

- ✓ Ці згодны вы са сцвярджэннем Ільі Ільфа і Яўгена Пятрова: «Няма прафесій з вялікай будучыняй, але ёсць прафесіяналы з вялікай будучыняй»?
- ✓ Як бы вы закончылі сказ: «Праз 10 год я бачу сябе...»?
- ✓ Ці дапамог вам чэлендж больш дакладна вызначыцца з выбарам прафесіі?

***Пытанні для бацькоў***

- ✓ У якой прафесіі вы бачыце свайго(ю) сына (дачку)?
- ✓ Ці згодны(а) ён (яна) з вашым меркаваннем?
- ✓ Пры якіх умовах ваш(а) сын (дачка) можа дасягнуць сваёй мэты?

## ЛІТАРАТУРА


1. **Куровская, С. Н.** Методика ознакомления школьников с профессиями: пособие / С. Н. Куровская. – Гродно: ГрГУ, 2013. – 65 с.
2. **Тесты для выбирающих профессию** / сост. А. М. Кухарчук, В. В. Лях, С. Г. Макарова. – Минск: Современная школа, 2008. – 288 с.